*І.С. ДАБРАВОЛЬСКАЯ*

# ТЫПЫ ЖЫЦІЙ У БЕЛАРУСКАЙ І СЕРБСКАЙ КНІЖНАСЦІ XII-XIII ст.

Посвящается сравнительному анализу восточнославянской (белорусской) и сербской агиографии; предлагаются критерии выделения многочисленных внутрижанровых агиографических произведений. Делается попытка определения национальных особенностей жанра на славянском материале.

The article is devoted to the review of the different types of saint's lives in Old Belarusian and Serbian literary traditions, analyses of the criteria are marked out. The author tries to find out the national specific of the genre in both, Serbian and Belarusian, Slavic literatures.

Агіяграфія, або апісанне жыцця святога (грэч. Ἅγιος - «святы» і γράφω «пішу»), - адзін з самых першых па часе ўзнікнення і ці не самы распаўсюджаны жанр візантыйскай літаратуры. Генезіс жыційнага жанру прасочваецца ад часоў ранняга хрысціянства. Ад самага пачатку агіяграфічная літаратура падзялялася на дзве плыні, якія ўзніклі незалежна

адна ад другой. Да першай адносіліся заснаваныя на судовых запісах або пратаколах допытаў ранніх хрысціян «мартырыі» (грэч. μαρτύριον - пакутніцтва), дзе апавядаецца пра пакутніцкую смерць за веру хрысціяніна, які пацярпеў ці зведаў пераслед ад язычнікаў. П. Безабразаў адзначае, што ў большасці выпадкаў дзеянне адбывалася ўсё ж у легендарных абставінах, а крыніцамі вобразаў была Біблія і грэчаскія трагедыі (гл. Безобразов 213). Другая разнавіднасць агіяграфічнага жанру - уласна жыціе, або біяс (грэч. βίος). Вытокі біясу, несумненна, трэба шукаць у антычнай біяграфіі яе класічнага перыяду - ад IV ст. да н. э. да V ст. н. э. Біясы прысвячаліся свяціцелям, свяшчэннаслужыцелям, рэлігійным падзвіжнікам і проста праведным людзям, якія скончылі свой зямны шлях. Паступовае шырокае распаўсюджанне біясу не азначала поўнага выцяснення мартырыя, гэтай формай працягвалі карыстацца і пазней, калі з'явілася патрэба ў апісанні ўціску на хрысціян з боку арабаў, туркаў (асабліва гэта тычыцца цэлага корпусу т. зв. «новых» балканскіх мартырыяў X I-XIX ст.). Вылучэнне мартырыя ў асобны жанр зусім не пазбаўлена сэнсу, бо мартырыі ці «цярпенні» сапраўды вызначаюцца своеасаблівым сюжэтам ці «жанравым трафарэтам» - аповед у іх будуецца не вакол подзвігаў (дзеянняў, учынкаў, спраў) святога, а вакол пакуты («цярпення»), якую зазнае цярплівец за веру Хрыстову, або гэта спакушэнні і выпрабаванні інака д'яблам. Такімі сюжэтамі насычаны Пацерыкі і папулярныя ў славян перакладныя «Рымскія дзеі». Структурна творы такога жанру будуюцца па іншай схеме, чым біясы, дзе можа адсутнічаць аповед пра нараджэнне і дзяцінства святога, тэматыка даволі разнастайная - мартырыі прысвячаюцца і дзецям, і жанчынам, але звяртае на сябе ўвагу той факт, што з'яўленне твораў гэтага жанру строга рэгламентавана пэўнымі эпохамі - гэта раннехрысціянскія часы, першыя стагоддзі хрысціянства ў славянскіх краінах. У стылістычным плане мартырыі пішуцца ў даволі стрыманай манеры; ім не ўласцівы прасветлены, радасны тон, характэрны для іншых твораў агіяграфіі. У сваю чаргу біяс (ці даслоўна «жыццё») падзяляецца на два тыпы ў залежнасці ад стылістычнай афарбоўкі: просты апавядальны і ўпрыгожаны панегірычны. Падзел жыційных тэкстаў на гэтыя два тыпы можна вытлумачыць генетычным фактарам: у аснову кожнага з іх пакладзены асобны тып грэчаскай біяграфіі. Так, у аснове апавядальнага тыпу знаходзіцца так званы гіпамнематычны тып біяграфіі, г. зн. кароткая даведка аб паходжанні героя, яго знешнім выглядзе, асноўных падзеях жыцця і абставінах смерці (гл. Аверинцев 1973, 172). «Даведкавы характар рашуча пераўзыходзіць апавядальнасць, "інфармацыя" - апавяданне. <...> Такая біяграфія імкнулася да рубрыкаванай структуры (падобная структура стымулявалася рытарычнымі тэндэнцыямі)», што ў сваю чаргу забяспечвала пераканаўчасць паведамляемай інфармацыі, - не рытарычныя ўпрыгожанні былі пафасам, але сукупнасць карысных і забаўляльных паведамленняў (Аверинцев 1973, 186). Рытарычны тып біяграфіі (εγκωμιον - «славаслоўе» або ψόγος - «зняслаўленне»), дзе аўтарам ажыццяўляўся эмацыянальна-ацэначны адбор біяграфічнага матэрыялу для адпаведнай яго падачы, пазней выклікаў да жыцця панегірычныя біясы. «Падзел усёй біяграфічнай літаратуры на гіпамнематычную і рытарычную надоўга перажыў антычнасць. Мы сустракаем яго і ў візантыйскай агіяграфіі: простая, без штукарстваў даведка аб часе, абставінах і ладзе жыцця святога - гэта βίος καί πολιτεία; іншаказальная і патэтычная перапрацоўка гэтай даведкі - εγκωμιον» (Аверинцев 1973, 188). З панегірычным і апавядальным тыпамі жыцій суадносяцца такія азначэнні, як дыдактызм і наратыўнасць. Калі прасачыць іх карэляцыю, то можна заўважыць, што тэрміны некалькі рознаскіраваныя. Так, павучальны

пафас уласцівы агіяграфіі ад самага пачатку, але, як заўважае Д.С. Ліхачоў, «з цягам часу дыдактызм не паслабляецца, а толькі ўзмацняецца», паколькі Вялікія Чэцці-Мінеі ствараліся як звод павучальнага чытання (Лихачев 1999, 490). Наратыўнасць жа ў супрацьлегласць дыдактыцы вылівалася ва ўзмацненне сюжэтнага пачатку.

Аднак спектр жыційных «паджанраў» быў яшчэ шырэйшы: акрамя жыція і мартырыя, ён уключаў у сябе аповесць пра пераслед і катаванні пакутнікаў, хаджэнне, казанне пра цудатворную ікону, бачанне цуда. Гэтыя тексты, розныя паводле жанру і стылю, былі аб'яднаны функцыянальна, бо аднолькава выкарыстоўваліся ў шанаванні святых.

Такім чынам, агіяграфія ўяўляе сабой сукупнасць жанраў, аб'яднаных па прынцыпе «жанравых асацыяцый», сярод якіх нас цікавіць уласна жыціе ці біяс. Зрэшты, толькі апавядальнага тыпу жыціе, якое апісвае біяграфію і дзейнасць святога, і варта называць жыціем. Але, як адзначае Д.С. Ліхачоў, «асновай для вылучэння жанру <...> быў прадмет, тэма, якой прысвечаны твор» (Лихачев 1973, 163). Як сфармуляваў гэта І. Калагрываў, адлюстраванне вобраза святога «не павінна ісці ўразрэз з традыцыйна ўстаноўленым уяўленнем пра яго <...>. Кожнай катэгорыі святых адпавядае ўзор <...>, які ўяўляе сабой не столькі ўспамін аб зямным жыцці святога, колькі яго праслаўленае духоўнае адлюстраванне» (Кологривов, 63). Падобна іконе, «трафарэт» жыція выбіраўся ў залежнасці ад тыпу героя твора. Л.А. Дзмітрыеў прыводзіць наступныя тыпы жыцій: пакутніцкае, спаведніцкае, святацельскае, прападобніцкае, юродзівых (Дмитриев 1973,406). Такая класіфікацыя агіяграфічных помнікаў у залежнасці ад подзвігу святога можа разглядацца таксама як уласна літаратурная, зробленая на падставе размежавання груп сюжэтаў, агіяграфічных прыёмаў.

З гісторыі візантыйскай агіяграфіі вядома, што ў IX-X ст. быў назапашаны стабільны корпус твораў, выпрацаваны прыёмы і форма жанру. Даследуючы пытанне засваення багацця візантыйскай літаратуры, І.П. Яромін прыходзіць да высновы, што славянскімі кніжнікамі (спачатку на поўдні, потым на ўсходзе) перакладаліся пераважна аўтары IV-VI ст., творы якіх у тагачаснай Візантыі ўспрымаліся як архаічныя (узорнымі ў славян лічыліся «Жыціе Антонія Вялікага» Афанасія Александрыйскага, біясы Кірыла Скіфапольскага) (гл. Еремин 1966, 240). «Аздоблены», квяцісты стыль жыцій Сімяона Метафраста з'яўляецца на славянскім усходзе толькі ў XIV-XV ст., на поўдні некаторыя вучоныя адзначаюць яго з'яўленне ў сербскай літаратуры ў XIII ст. «Пранікненне <...> мясцовых, нацыянальных элементаў у агіяграфію было даволі моцным, і ў IX—XII ст. <...> руская літаратура знаходзілася пад значна меншым уласна візантыйскім літаратурным уплывам, чым гэта прынята думаць» (Еремин 1966, 17). Нацыянальнае ў межах універсальнага сярэднявечнага тыпу літаратур выяўляецца таксама ў стварэнні новых, нехарактэрных для сістэмы разнавіднасцей паджанраў.

Пачаткі арыгінальнага пісьменства на славянскім усходзе, у прыватнасці, агіяграфія, яе змест і форма, у большай ступені, чым ад фактараў літаратурнага характару, залежалі ад сацыякультурнага кантэксту эпохі. Кантэкст вымагаў ад новай хрысціянскай краіны і паступовага фарміравання нацыянальных цэркваў, якія адстойвалі перад Візантыяй сваю палітычную і царкоўную незалежнасць. Адпаведна, ствараліся культы сваіх святых і літаратурныя жыціі, неабходныя для кананізацыі падзвіжніка. Трэба зазначыць, што ў агульным фондзе помнікаў агіяграфія ўсходніх славян XI-XIII ст. не займае пануючага месца. І ўсё ж у параўнанні з больш развітой жанравай сістэмай Візантыі гамілетыка і агіяграфія набылі «непрапарцыянальна вялікае значэнне... амаль манаполію» (Подскальски 1996, 435).

Першы ўсходнеславянскі твор гэтага жанру з'явіўся ў сярэдзіне XI ст. - «Сказание пра Барыса і Глеба», складзенае на аснове летапісных звестак і «Чытання... аб Барысе і Глебе» Нестара. Нетыповасць агіяграфічнага ідэалу, які сцвярджаўся ў «Сказанні», вынікала з нацыянальнай афарбоўкі ўсіх сфер жыцця на ўсходзе - княжацкіх міжусобіц, барацьбы за ўладу, імкнення царквы ўзяць на сябе кансалідуючую ролю і павысіць свой статус. «Сказание» прысвечана братам-князям, якія прынялі пакутніцкую смерць ад адзінаверца і сваяка ў імя аб'яднання княжацкага роду і ў гонар ідэі пакорлівасці старэйшаму. Такім чынам, ідэал феадальнага грамадства больш прыняты ў агіяграфіі насуперак візантыйскай традыцыі, а «культ Барыса і Глеба, заснаваны на перакананні, што нявінная ахвяра забойства - гэта цярпенне, можа служыць прыкладам мясцовых адхіленняў» (Оболенский 1970, 13).

В.П. Адрыянава-Перацц вылучае ў агіяграфіі XI ст. два тыпы сюжэтаў: 1)прысвечаны ідэальнаму герою, які парывае сувязі са светам і 2) герою, які паводзіць сябе ў адпаведнасці не толькі з хрысціянскім, але і феадальным ідэалам, пры гэтым «храналагічна другая трупа апярэдзіла першую»: жыціі князёў узніклі раней, чым склаўся манастырскі побыт і былі створаны жыццяпісы іх заснавальнікаў-манахаў (гл. Адрианова-Перетц 1964, 91). «Жыціе Феадосія Пячорскага» адносіцца да другога тыпу сюжэтаў і ўяўляе сабой адно з самых цікавых у кніжнасці ўсходніх славян. Дзякуючы пэўным архаічным элементам у ім прасочваецца «адносная гістарычнасць» пры абмалёўцы персанажаў, увага да дэталяў побыту, прастадушнасць выкладу, адзначаныя рысы з'яўляюцца характэрнымі для біясаў даметафрастаўскай традыцыі (гл. Еремин 1966, 8).

На беларускай глебе ў канцы XII ст. была створана служба і ранні тэкст жыція Еўфрасінні Полацкай, якія не дайшлі да нашага часу. «Аповесць жыцця і смерці прападобнай Еўфрасінні» захавалася ў чатырох рэдакцыях XVI ст. (А. Мельнікаў прыводзіць дадзеныя аб шасці), кожная з якіх нясе на сабе адбітак пэўнай ідэалогіі - рэдакцыя Макар'еўскіх Чэцьяў-Міней і «Ступеннай кнігі» найбольш паказальныя ў гэтым сэнсе (гл. Мельнікаў 1995, 22, Барсуков, 167). У XIII ст. з'яўляецца «Жыціе Аўраамія Смаленскага» - «апошняе прыкметнае жыціе гэтага (дамангольскага) перыяду» (Робинсон 1980, 102). Я.Я. Галубінскі называв гэты твор у ліку трох пашыраных рэдакцый жыцій дамангольскай пары, якія вылучаюцца найменшай трафарэтнасцю (гл. Голубинский, 78). В.Н. Тапароў адзначае незвычайнасць подзвігу Аўраамія - барацьба за права пазнання ў рэлігійнай сферы (што выклікае пераслед з боку адзінаверцаў) (гл. Топоров 1996, 149). Арыгінал «Жыцця трох віленскіх пакутнікаў Іаана, Антонія і Яўстафія» (XIV ст.), як пераканаўча даказваецца ў даследаванні М.Н. Спяранскага, быў створаны ў Царградзе грэкамі (перад кананізацыяй пакутнікаў патрыярхам Філафеям у 1374 г., якая адбылася неўзабаве пасля перанясення мошчаў у Царград), пасля чаго яно было ўключана ў так званы Сцішны сінаксар, папулярны на славянскім поўдні (пераклад XV ст.), адкуль - праз Балгарыю, аб чым сведчаць моўныя асаблівасці - помнік трапіў да ўсходніх славян (гл. Сперанский, 1-48). Але з-за выключных абставін з'яўлення тэты твор не атрымаў распаўсюджання (Ф. Дабранскі ўказвае толькі пяць тэкстаў), вядомы тры яго рэдакцыі (з ідэалагічнай праўкай) (гл. Добрянский, 244). Пералічаныя тэксты з'яўляюцца найбольш паказальнымі ў агіяграфіі XI—XIV ст. і належаць да асноўных тыпаў: жыцій пакутніцкіх, княжацкіх і падзвіжніцкіх. Тэрытарыяльная раздробленасць земляў усходніх славян перашкаджала распаўсюджанню гэтых твораў, фактычна яны былі мала вядомы за межамі тэрыторыі напісання.

Развіццё літаратуры пад уладай Стэфана Нэмані ў сярэдзіне XII ст. цесна звязана з аб'яднаннем сербскіх земляў. Агіяграфічны жанр займае цэн-

тральнае становішча ў сістэме кніжнасці на працягу XIII і XIV ст. «Ці не самым значным жанрам старажытнасербскай літаратуры <...> яскравым выразнікам сербскай этнічнай самасвядомасці і ідэі сярэднявечнай сербскай дзяржаўнасці, быў жанр жыцій, аўтарамі якіх былі нярэдка сербскія ўладары і архіепіскапы; ім жа, як правіла, і прысвячаліся жыціі...» (Толстой 1989, 124). У.А. Мошын звяртае ўвагу на незвычайную распрацаванасць жанру: высокія дасягненні агіёграфаў, што можа быць растлумачана толькі існаваннем у сербаў літаратуры раней канца XII ст. (гл. Мошин 1963, 64). Аднак помнікі таго часу не захаваліся, а росквіт культуры ў XIII ст. звязаны з канчатковым выхадам Сербіі з-пад улады Візантыі, стварэннем самастойнай дзяржавы і аўтакефальнай царквы (1219). Амаль цалкам корпус помнікаў той пары праслаўляе дынастыю Нэманічаў (замацаваная за імі ў славістыцы назва - «дынастычная агіябіяграфія»). Першы біёграф XIII ст.- Сава Нэманіч, аўтар «Жыція Сімяона» (Стэфана Нэмані, першага ўладара з дынастыі, які пастрыгся ў манахі ў канцы жыцця). «Жыціе Сімяона» было створана яшчэ да кананізацыі Нэмані і таму Сава не называв яго святым і не апісвае абавязковых цудаў пасля смерці князя. На самай справе гэта першыя главы Студзеніцкага тыпікону, калі па візантыйскім узоры выкладу правілаў жыцця ў манастырах папярэднічала кароткае жыціе кцітара. П. Попавіч называв гэта жыціе «самым простым і самым невялікім» (Попович 1912, 15). Наступнікі Савы таксама лічылі неабходным звярнуцца да асобы першага ўладара дзяржавы. Так, Стэфан Першавенчаны, другі сын Нэмані, піша другую яго біяграфію - «Жыціе святога Сімяона», дзе на фоне сваіх вайсковых подзвігаў апісвае цуды і жыццё бацькі. Па загаду караля Ураша ў сярэдзіне XIII ст. Даменціянам, афонскім манахам, было створана «Жыціе святога Савы» - першы сапраўды вялікі (230 друкаваных старонак у выданні Дж. Данічыча) біяс сярэднявечнай літаратуры Сербіі. Паклаўшы ў аснову твор Стэфана Першавенчанага, Даменціян піша і біяграфію Нэмані, менш значную за папярэдняе жыціе. У абедзвюх агіябіяграфіях пераважае рыторыка, наратыўнасць зведзена да мінімуму. Эстэтыка-ідэалагічныя прычыны ўжо ў хуткім часе выклікалі патрэбу ў стварэнні іншага жыція. Тэадосіем, таксама афонскім манахам, у канцы XIII - пачатку XIV ст. было створана (на падставе Даменціянава тэксту) другое пашыранае «Жыціе святога Савы». «Стылістычна і літаратурна ўвогуле гэтая біяграфія - найлепшая, яна ў той жа час - адзін з лепшых твораў усёй нашай старажытнай славеснасці» (Попович 1912, 17). Тэадосій з'яўляецца аўтарам яшчэ аднаго жыція - «Жыція Пятра Корышскага», пустэльніка другой паловы XIII ст. «Гэта адзіная ў сербскай літаратуры арыгінальная агіяграфія, прысвечаная асобе, якая не належала ні да свецкай, ні да духоўнай улады» (Rapaczka 1996, 34). Пасля Тэадосія кніжнасць развівалася ў тым жа напрамку - складаліся жыціі ўладароў і архіепіскапаў, але не як асобныя творы, а тэматычна звязаныя, у зборнік «Жыціі каралёў і архіепіскапаў сербскіх». Аўтарства на першым этапе належыць архіепіскапу Данілу II, пачатае прадоўжылі яго вучні. Асобна можна вылучыць «Жыціе караля Мілуціна» Данілы II. Яно працягвае традыцыі «дынастычнай агіябіяграфіі» і вылучаецца самым вялікім аб'ёмам. Звяртае на сябе ўвагу і «Жыціе Стэфана Дэчанскага», складзенае ананімным вучнем Данілы II. Гэты твор прысвечаны пакутніку, што само па сабе нетыпова для агіяграфіі той пары, прасякнутай «светлымі, бадзёрымі інтанацыямі», звязанымі з умацаваннем палітычнай магутнасці краіны (гл. Rapaczka 1996, 36).

Прыведзеныя факты з гісторыі развіцця жыційнага жанру на сербскіх і беларускіх землях дазваляюць вылучыць некаторыя агульныя прынцыпы на падставе таго асаблівага значэння, якое мела агіяграфія ў абедзвюх літаратурах. Уваходзячы ў склад хрысціянскіх дзяржаў, Сербія і Русь павінны былі адстойваць сваю палітычную і царкоўную незалежнасць з да-

памогай абвяшчэння нацыянальных культаў. Агіяграфія, як і літаратура тых часоў у цэлым, мела яскравую грамадска-палітычную скіраванасць і ўяўлялася як «новае адгалінаванне дыдактыкі і гамілетыкі ў выглядзе <...> актуальных для славянскай раннефеадальнай дзяржаўнасці жыцій князёў, а не манахаў-аскетаў» (Робинсон 1980, 91), якія закліканы былі служыць умацаванню ўласных, агульнанародных культаў святых. На Русі героямі падобных культаў сталі святыя Барыс і Глеб, у Сербіі - бацька і сын Нэманічы (Сімяон і Сава). Такім чынам, абумоўленыя агульнымі гістарычнымі працэсамі, падабенствам форм дзяржаўнай і царкоўнай улады і агульнай рэлігіяй, у беларускай літаратуры старажытнага перыяду і сярэднявечнай сербскай літаратуры ўзнікаюць невядомыя ў Візантыі княжацкія жыціі. Звяртае, аднак, на сябе ўвагу карэннае адрозненне між гэтымі творамі - сербскія жыціі святых Сімяона і Савы праслаўляюць асветнікаў, абаронцаў і патронаў бацькаўшчыны, тады як у жыціі Барыса і Глеба даецца прыклад самаахвяравання ў імя адзінства дзяржавы. Г.П. Фядотаў у сваіх роздумах аб асаблівасцях старажытнарускай святасці называв яе «кенатыпічнай» (добраахвотнае самапрыніжэнне), якая паслядоўна наследавала Хрысту (гл. Федотов, 98). Падобныя адрозненні вынікалі, у тым ліку, з розных унутрыпалітычных сітуацый - феадальныя раздробленыя і варагуючыя паміж сабой княствы на Русі і аб'ядная дзяржава з аўтакефальнай царквой у Сербіі. Адсюль, дарэчы, і культывацыя візантыйскай ідэі «сімфоніі дзяржавы і царквы» ў жыціях Сімяона і Савы.

У творах сербскіх, як і ўсходнеславянскіх аўтараў, знайшлі яскравае адлюстраванне працэсы станаўлення дзяржаўнасці і ідэалогіі. Абедзве літаратуры фіксуюць невядомы ў Візантыі жанр княжацкага жыція (напэўна, агульны ў старажытных літаратурах усіх славян, аб чым сведчаць помнікі, якія захаваліся, - «Жыціе Людмілы і Вацлава Чэшскіх», адна з рэдакцый якога, дарэчы, паўднёваславянская, змешчана ў глагалічным брэвіярыі XI ст.). Як лічыць А.Н. Рабінсон, менавіта жыціе чэшскіх князёў служыла прыкладам для складання «Жыція Барыса і Глеба».

Цвёрдыя крытэрыі ўнутрыжанравай (уласна, і жанравай таксама) класіфікацыі, паводле якіх можна дастаткова ўпэўнена ідэнтыфікаваць той ці іншы жанравы падтып агіяграфіі, забяспечваюць, як бачна, толькі пазалітаратурныя абставіны. Паняцце канона можна экстрапаліраваць дастаткова шырока і на паджанравыя тыпы. Калі прааналізаваць канон, дык варта адзначыць, што ён забяспечвае не толькі аднатыпнасць і рэгламентаванасць будовы (узровень структуры ці кампазіцыі), але і адбор фактычнага матэрыялу (тэматыка), а ў залежнасці ад тэматыкі - характарыстыку героя і манеру апавядання (стыль). Такім чынам, канон як катэгорыя большага аб'ёму, вышэйшага ўзроўню складанасці паглынае жанр і жанравыя ўтварэнні як больш дробныя, прыватныя адзінкі класіфікацыі. Гэта даволі кардынальна аблегчыла б падыход да неаднароднай структуры агіяграфіі, дзе «ўсе часткі рознастылёвыя і рознажанравыя» і аб'яднаны толькі функцыянальна. Разам з тым, пабудаваная на аснове некалькіх класіфікацыйных прыкмет, унутрыжанравая тыпалогія дапаможа глыбей спасцігнуць феномен агіяграфічнага жанру ва ўсёй яго шматбаковасці і шматграннасці праяў.

ЛІТАРАТУРА

Аверинцев С.С. Плутарх и античная биография. М., 1973.

Адрианова-Перетц В.П. Задачи изучения «агиографического стиля» Древней Руси // Труды отдела древнерусской литературы. М.; Л., 1964. Т. XX. С. 24-62.

Барсуков Н. Источники русской агиографии. СПб., 1882.

Безобразов П. Византийские сказания. Рассказы о мучениках. Юрьев, 1917. Ч. 1.

Голубинский Е.Е. История канонизации святых в русской церкви. СПб., 1849.

Дмитриев Л.А. Литературные судьбы жанра древнерусских житий (церковно-служебный канон и сюжетное повествование) // Славянские литературы. VII Международный съезд славистов. Варшава, авг. 1973. М., 1973. С. 400-419.

Д о б р я н с к и й Ф. Описание рукописей Виленской публичной библиотеки церковно-славянских и русских. Вильна, 1882.

Е р е м и н И. П. Литература Древней Руси (Этюды и характеристики). М.; Л., 1966.

К о л о г р и в о в И. Очерки по истории русской святости. Вильнюс, 1991.

Л и х а ч е в Д. С. Зарождение и развитие жанров древнерусской литературы // Славянские литературы. VII Международный съезд славистов. Варшава, 1973. М., 1973. С. 160-177.

Л и х а ч е в Д. С. Историческая поэтика русской литературы. Смех как мировоззрение. СПб., 1999.

М е л ь н і к а ў А. «Жыціе» і жыццё Еўфрасінні, ігуменні Полацкай // Адраджэнне. Мн., 1995. Вып. 1. С. 9-22.

М о ш и н В.А. О периодизации русско-южнославянских литературных связей X-X вв.// Труды отдела древнерусской литературы. М.; Л., 1963. Т. XIX. С. 28-107.

О б о л е н с к и й Д. Связи между Византией и Русью в XI-X вв. М., 1970.

П о д с к а л ь с к и Г. Христианская и богословская литература в Киевской Руси. СПб., 1996.

П о п о в и ч П. Обзор истории сербской литературы. СПб., 1912.

Р о б и н с о н А. Н. Литература Древней Руси в литературном процессе средневековья. Очерки литературно-исторической типологии. М., 1980.

С п е р а н с к и й М. Н. Сербское житие литовских мучеников// Чтения в Императорском обществе истории и древностей российских при Московском университете. М., 1909. Кн. 1. С. 1-48.

Т о л с т о й Н. И. Этническое и культурное самосознание сербов в связи с развитием письменности (литературы) и литературного языка в XII—XIV вв. // Развитие этнического самосознания славянских народов в эпоху зрелого феодализма. М., 1989. С. 117-130.

Т о п о р о в В. Н. Святость и святые в русской духовной культуре. М., 1996. Т. 2.

Ф е д о т о в Г. П. Святые Древней Руси. М., 1990.

R a p a c z k a J. Dawna literature serbska. Krakow, 1996.

Паступіў у рэдакцыю 23.02.06.

***Ірына Сяргееўна Дабравольская*** - суіскальніца кафедры славянскіх літаратур. Навуковы кіраўнік - доктар філалагічных навук, прафесар І.А. Чарота.